**УДК 94(476.6)"18/19"** **DOI 10.52928/2070-1608-2024-71-3-45-50**

# УВЯДЗЕННЕ ВАЕННА-АКРУГОВАЙ СІСТЭМЫ КІРАВАННЯ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1850-х – ПАЧАТКУ 1860-х гг.

***канд. гіст. навук А.В. ХАВАНСКІ***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы)***

*Разглядаецца шырокае кола пытанняў, звязаных з асаблівасцямі падрыхтоўкі і рэалізацыі ваеннай рэформы на беларускіх землях. У артыкуле вызначаны асноўныя напрамкі дзейнасці чыноўнікаў ваеннага ведамства па распрацоўцы варыянтаў удасканалення сістэмы ваеннага кіравання. У працэсе даследавання быў праведзены глыбокі аналіз прычын, якія абумовілі змены ў палітыцы ўрада ў галіне ваеннага кіравання ў рэгіёне. У храналагічнай паслядоўнасці скрозь прызму нарматыўна-прававаых актаў паказаны працэсы фарміравання і заканадаўчага афармлення акруговых інстытутаў кіравання ў краі. Вызначаны фактары, якія аказвалі негатыўнае ўздзеянне на фарміраванне акруговай структуры кіравання. Паказаны арганізацыйныя мерапрыемствы ваеннага міністэрства, накіраваныя на паляпшэнне ўстройства Віленскай ваеннай акругі. Адзначаецца, што рэалізацыя мерапрыемстваў па стварэнні ваенна-акруговай сістэмы на беларускіх землях у пачатку 1860-х гг. ажыццяўлялася ў складаным міжнародным і грамадска-палітычным становішчы, звязаным з наступствамі Крымскай вайны і антыўрадавымі выступленнямі ў заходніх рэгіёнах імперыі. Надзвычайныя абставіны абумовілі рэпрэсіўнакарны характар яго структуры і паўнамоцтваў. Пры гэтым, разам з агульнымі рысамі, у працэсе фарміравання Віленскай ваеннай акругі склаліся мясцовыя асаблівасці, якія адлюстроўвалі ўзровень ваенных пагроз у рэгіёне.*

*Вынікі і высновы даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы навучальных дапаможнікаў, лекцыйных і спецыяльных курсаў па айчыннай і ваеннай гісторыі для студэнтаў і курсантаў вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь.*

***Ключавыя словы:*** *Расійская імперыя, Віленская ваенная акруга, беларускія землі.*

**Уводзіны.** У першай полове XIX ст. адбываюцца істотныя змены на міжнароднай арэне. Нягледзячы на крушэнне асноў Венскай сістэмы міжнародных адносін яшчэ да 1840-х гг., на яе падмурку працягвалі рэгулявацца шматлікія геапалітычныя супярэчнасці. Толькі ў сувязі з чарадой рэвалюцыйных падзей у Еўропе у 1848–1849 гг. адбыўся яе канчатковы дэмантаж. На фоне крушэння старой сістэмы міжнародных адносін у еўрапейскай палітыцы сталі пераважаць нацыянальныя ідэі, якія сталі вызначальнымі для многіх дзяржаў. У гэтых абставінах у цэнтры ўвагі знешняй палітыкі Расійскай імперыі, сярод іншых, па-ранейшаму вострa стаялі «ўсходняе» і «польскае» пытанні. Ва ўмовах эскалацыі геапалітычнай сітуацыі ў рэгіёне асноўныя намаганні дзяржаўных інстытутаў улады былі накіраваны на ўзмацненне Узброеных Сіл і ўмацаванне ваеннай бяспекі. У ходзе іх рэалізацыі асаблівае месца адыгрывае ваенна-акруговая рэформа, распачатая на беларускіх землях у пачатку 1860-х гг. На сённяшні дзень у айчыннай гістарыяграфіі адсутнічаюць спецыяльныя працы, прысвечаныя праблеме ўстройства Віленскай ваеннай акругі. Варта адзначыць, што апублікаваныя на сённяшні дзень працы адлюстроўваюць асаблівасці рэалізацыі ваеннай рэформы на беларускіх землях вельмі коратка і, як правіла, у кантэксце разгляду іншых пытанняў. Сярод іх найбольшую цікавасць уяўляе першы том і дадатак да яго выдання «Стагоддзе ваеннага міністэрства. 1802–1902», непасрэдна прысвечанага гісторыі развіцця ваеннага кіравання ў Расійскай імперыі. Ён дае агульнае ўяўленне аб працэсах ваеннага будаўніцтва на яе тэрыторыі [1; 2]. Несумнеўную цікавасць уяўляе праца калектыва расійскіх гісторыкаў А.Ю. Безугольнага, Н.Ф. Кавалеўскага і В.Я. Кавалева, у якой змяшчаюцца звесткі аб развіцці ваенна-акруговай сістэмы ў Расіі ў 1862–1918 гг. [3]. Пытанні дзейнасці вышэйшых службовых асоб арміі па ўладкаванні ваенна-акруговай сістэмы ў краіне ўсебакова адлюстраваны на старонках успамінаў ваеннага міністра, генерал-маёра Д.А. Мілюціна [4; 5].

Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца выяўленне асаблівасцей будовы ваенна-акруговай сістэмы на беларускіх землях у працэсе рэарганізацыі структуры ваеннага кіравання Расійскай імперыі.

**Асноўная частка.** Рэвалюцыйныя падзеі 1848 г. у Еўропе не распаўсюдзіліся на Каралеўства Польскае і заходнія губерні Расійскай імперыі. Нацыянальны рух разгарнуўся тут толькі пасля паражэння ў Крымскай вайне і пачатку правядзення рэформ у краіне. Да гэтага часу на тэрыторыі Каралеўства Польскага, Літвы, Беларусі і Украіны склаліся розныя палітычныя плыні. Сярод іх былі прыхільнікі супрацоўніцтва з Пецярбургам з мэтай дасягнення аўтаноміі. У сваю чаргу, ліберальная шляхта і мясцовая буржуазія (партыя «белых») выступалі за рэформы і імкненне да незалежнасці, але мірным шляхам. У канцы 1850-х – пачатку 1860-х гг. з'явіліся прыхільнікі паўстання (партыя «чырвоных»), якія заклікалі да аднаўлення незалежнасці Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Дыпламатычная падтрымка вядучымі заходнееўрапейскімі дзяржавамі польскага руху стварала для афіцыйнага кіраўніцтва імперыі сур'ёзную знешнепалітычную небяспеку. Так, калі Прусія абяцала сваю падтрымку Расійскай імперыі, Францыя і Англія выступалі супраць яе.

Крымская вайна 1853–1856 гг. аказала істотны ўплыў на змены расстаноўкі сіл на еўрапейскім кантыненце, калі прэтэнзіі імператара Мікалая I на ўстанаўленне расійскай гегемоніі на Блізкім Усходзе і ў Асманскай імперыі натыкнуліся на супраціўленне заходніх дзяржаў. Кіруючыя колы Вялікабрытаніі і Францыі не хацелі ўзмацнення

ролі Расійскай імперыі на міжнароднай арэне. Акрамя таго, супраць пашырэння расійскага ўплыву на Балканах выступала Аўстрыя. Такім чынам, у другой палове 1850-х гг. Расійская імперыя фактычна апынулася ў стане міжнароднай ізаляцыі, а яе геапалітычныя пазіцыі былі значна аслаблены [6, с. 323].

Разам са знешнепалітычнымі прычынамі, неабходнасць узмацнення ваеннага ведамства вызначалася галоўным чынам унутрыпалітычнымі абставінамі. Баявыя дзеянні падчас Крымскай вайны паказалі значныя недахопы як ва ўнутраным дзяржаўным ладзе, так і ў яе ваеннай арганізацыі. Расійская імперыя, маючы абсалютную колькасную перавагу ў насельніцтве і велізарныя матэрыяльныя сродкі для вядзення ўзброеннай барацьбы, не змагла належным чынам гэтым скарыстацца. Арганізацыя ваеннага кіравання дзяржавы не справілася з пастаўленымі перад ёй задачамі і ў цэлым аказалася не гатовай да новых умоў вядзення вайны. Абстаноўка, якая склалася ў краіне пасля заканчэння вайны, адзначылася нарастаннем рэвалюцыйнай сітуацыі ў некаторых рэгіёнах імперыі. Негатыўны адбітак на ўнутрыпалітычнае становішча краіны наклала і смерць ў лютым 1855 г. імператара Мікалая I. Вырашэнне праблем па рэарганізацыі ваеннай арганізацыі кіравання выпала на час праўлення імператара Аляксандра II [1, с. 374].

Рэгулярная армія Расійскай імперыі ў сярэдзіне XIX ст. было прадстаўлена дзеючымі, рэзервовымі, запаснымі, мясцовымі і дапаможнымі войскамі і не мела, што варта падкрэсліць, адзінага цэнтра кіравання. Так, 1-я армія, якая дыслацыравалася ў Каралеўстве Польскім і на заходніх межах імперыі, знаходзілася пад кіраўніцтвам галоўнакамандуючага. Яму падпарадкоўваліся ўсе без выключэння грамадзянскія і ваенныя інстытуты ўлады на ўзгаданай тэрыторыі. У сваю чаргу, ваеннаму міністру былі падуладныя войскі, якія размяшчаліся ва ўнутрырасійскіх губернях, рэзервовыя часткі, а таксама Асобны корпус унутранай варты і мясцовыя ваенна-гаспадарчыя органы. Акрамя таго, на адмысловым становішчы былі асобныя корпусы, бо знаходзіліся пад камандаваннем чальцоў імператарскага роду. Выключны статус атрымалі войскі ў Вялікім княстве Фінляндскім, асобныя Каўказскі і Арэнбургскі корпусы. Пры гэтым парадак арганізацыі ўзаемадзеяння паміж вышэйназванымі злучэннямі і ваенным міністэрствам ніяк не агаворваўся [7, с. 3–4].

Арганізацыя мясцовага ваеннага кіравання ў Расійскай імперыі ў 1850-я гг. складалася з сукупнасці часта раз'яднаных органаў і ўстаноў з дакладна нявызначанымі паўнамоцтвамі і функцыямі. Адсутнічала выразная ўзаемасувязь паміж цэнтральнымі і мясцовымі вайсковымі адміністрацыямі. Цэнтральныя органы ваеннага ведамства на месцах былі прадстаўлены артылерыйскім, інжынерным, камісарыяцкім і правіянцкім дэпартаментамі, якія ажыццяўлялі ўсебаковае забеспячэнне войскаў на падведамных тэрыторыях. Пры гэтым раёны забеспячэння таго ці іншага дэпартамента ваеннага міністэрства не супадалі, што стварала дадатковыя цяжкасці для часцей і падраздзяленняў расійскай арміі. Найбольш востра гэта праблема адбівалася на беларускіх губернях. Тут адсутнічалі адзіныя цэнтры забеспячэння, а папаўненне мясцовых матэрыяльна-технічных запасаў ажыццяўлялася з розных і, часам, аддаленых частак імперыі. Пастаўкі ў рэгіён зброі і боепрыпасаў ажыццяўляліся ўпраўленнем Кіеўскай артылерыйскай акругі. Прадметы камісарыяцкага забеспячэння мясцовыя войскі атрымлівалі з Дынабургскай камісарыяцкай камісіяй. Правіянцкае забеспячэнне губерняў ажыццяўлялася не падпарадкаваным ваеннаму міністэрству правіянцкім упраўленнем 1-й арміі. Трэба заўважыць, што кожная з мясцовых гаспадарчых устаноў мела вельмі абмежаваныя паўнамоцтвы і павінна была па ўсіх, нават дробязных, пытаннях звяртацца да адпаведнага дэпартамента, правы якога таксама былі дастаткова сціплымі, і ў якім амаль усе справы даводзілася вырашаць калегіяльна [8, с. 24].

Праблема падвойнага падпарадкавання ў пачатку 1850-х гг. была характэрна і для артылерыі расійскай арміі. Так, у страявых адносінах артылерыйскія часткі знаходзіліся ва ўпраўленні генерал-фельцайхмайстра, які падпарадкоўваўся непасрэдна імператару, а пытанні забеспячэння і вырашэння іншых гаспадарчых пытанняў знаходзіліся ў кампетэнцыі ваеннага міністра і артылерыйскага дэпартамента на месцах, прадстаўленага прыгоннымі артылерыйскімі акругамі. Пры гэтым беларускія губерні тэрытарыяльна ўваходзілі ў склад адразу дзвюх прыгонных артылерыйскіх акруг – Заходняй і Кіеўскай. У цэлым ва ўмовах існаваўшага падзелу артылерыйскага кіравання паміж двума адасобленымі інстытутамі ўлады было вельмі праблематычна ажыццяўляць планамернае і паступальнае развіццё рода войск [4, с.75].

Падобнае становішча было характэрным і для інжынерных войск Расійскай імперыі. З аднаго боку, у апаратыўным плане інжынерныя злучэнні імперыі падпарадкоўваліся ўпраўленню генерал-інспектара па інжынернай частцы, па гаспадарчых пытаннях, з другога боку, – інжынернаму дэпартаменту ваеннага міністэрства, што стварала дадатковыя цяжкасці на шляху выканання пастаўленых задач. Упраўленне інжынернымі падраздзяленнямі на беларускіх землях было засяроджана ў дзвюх інжынерных акругах: Бабруйская крэпасць уваходзіла ў склад Кіеўскай, а Брэст-Літоўская – Заходняй інжынерных акруг. Значныя недахопы мясцовай ваеннай арганізацыі заключаліся ў дваістым характары ваеннага ўпраўлення, залішняй бюракратызацыі адносін паміж мясцовымі і цэнтральнымі ўстановамі ў спалучэнні з самаўпраўствам асобных ваенных чыноўнікаў [3, с. 23].

Правіянцкае забеспячэнне ва Узброеных Сілах імперыі таксама мела дэцэнтралізаваны характар. Правіянцкія ўстановы ў выглядзе камісій знаходзіліся ў 1-й арміі і ў асобных корпусах. На астатняй тэрыторыі дзяржавы існавалі органы правіянцкага дэпартамента ваеннага міністэрства ў выглядзе правіянцкіх камісій, камісіянерстваў і дыстанцый. Пры гэтым уся паўната распарадчай улады была сканцэнтравана ў палявых упраўленнях, якія знаходзіліся ў практычна незалежным становішчы ад міністэрства. Апошняе было пазбаўленае магчымасці кантраляваць іх дзейнасць і ў выпадку неабходнасці карэктаваць яе [1, с. 438].

У канцы 1850-х гг. у ваенным ведамстве былі рэалізаваны мерапрыемствы, накіраваныя на аптымізацыю структуры правіянцкага дэпартамента шляхам ліквідацыі правіянцкіх камісій. У выніку іх рэалізацыі былі скасаваныя Кіеўскае, Віленскае і Радамскае правіянцкія камісіянерствы і ў раёне дыслакацыі 1-й арміі заснаваны пасады обер-правіянтмайстраў. У выніку гэтых змен на беларускіх землях, у Віцебскай, Магілёўскай, Гродзенскай і Мінскай губернях, уводзіліся пасады обер-паліцмайстраў з зацверджаным штатам [9, с. 489].

Арганізацыяй рэчавага, грашовага забеспячэння войскаў, а таксама шпітальнай маёмасцю займаўся камісарыяцкі дэпартамент ваеннага міністэрства. Для забеспячэння войскаў уся тэрыторыя Расійскай імперыі была падзелена на 16 камісарыяцкіх камісій. Войскі, якія дыслакаваліся на беларускіх землях, не мелі адзінага цэнтра камісарыяцкага забеспячэння. Часткі, расквартараваныя ў Гродзенскай губерні, забяспечваліся Брэст-Літоўскай камісарыяцкай камісіяй, часткі якія размяшчаліся ў Мінскай і Віцебскай губернях – Дынабургскай камісарыяцкай камісіяй, а войскі з Магілёўскай губерні – Кіеўскай. Такі падзел у адносінах да атрымання прадметаў камісарыяцкага забеспячэння не ствараў умоў для эфектыўнага кіравання як у аператыўным, так і гаспадарчым плане [10, с. 267; 11, с. 50; 12, с. 69; 13, с. 141].

Іншы, не менш сур'ёзны, недахоп у арганізацыі камісарыяцкага забеспячэння заключаўся ў тым, што на адной і той жа ўстанове ляжалі абавязкі як па захаванні маёмасці, так і па распараджэнні ёю. Упраўленне і члены камісарыяцкай камісіі ў адзін і той жа час кіравалі нарыхтоўкай рэчаў, адказвалі за яе якасць, правільнасць прыёмкі і водпуск войскам. Такое адначасовае ўскладанне на адных і тых жа асоб распарадчых і кантрольных функцый, вядома, адмоўна адбілася на арганізацыі забеспячэння [4, с. 138].

Існуючае становішча ў галіне кіравання ваенным ведамствам аказвала негатыўнае ўздзеянне і на мабілізацыйныя магчымасці дзяржавы. Можна сабе толькі ўявіць, якія цяжкасці сустрэліся б у ходзе правядзення мабілізацыі пры такім раз'яднаным стане мясцовых органаў ваеннага кіравання. Можна з упэўненасцю сказаць, што хуткая мабілізацыя ў такіх умовах была б немагчымая. Прывядзенне арміі да ваеннага становішча запатрабавала б многіх месяцаў, нягледзячы на тое, што войскі тады былі ў значнай меры ўкамплектаванымі [5, с. 269].

Варта адзначыць, што расійскія ваенныя міністры, генералы ад кавалерыі А.І. Чарнышоў (1837–1852 гг.) і В.А. Далгарукаў (1852–1856 гг.) у сваіх дакладах імператару Мікалаю І не прадстаўлялі аб'ектыўнай інфармацыі аб недахопах, якія назапашваліся ў ваенным ведамстве, замоўчваючы існуючыя праблемы. У сваю чаргу, з прыходам да ўлады імператара Аляксандра ІІ высокапастаўленымі ваеннымі чыноўнікамі Расійскай імперыі былі падрыхтаваны шэраг прапаноў па паляпшэнні арганізацыі ваеннага кіравання ў выглядзе так званых запісак генерала-ад'ютанта Ф.В. Рыдзігера (1855 г.) і генерал-лейтэнанта Б.Р. Глінкі (ліпень 1856 г.). Аднак пададзеныя прапановы насілі больш тэарэтычную, чым практычную накіраванасць і не закраналі саміх асноў існуючага ваеннага ладу дзяржавы, яго галоўных праблем [2, с. 19–51; 3, с. 42].

У сакавіку 1856 г. сваё бачанне паляпшэння ўстройства ваеннага міністэрства прадставіў генерал-маёр Д.А. Мілюцін, які ў той час займаў пасаду для адмысловых даручэнняў пры ваенным міністры. У сваёй запісцы «Думкі аб нявыгадах існуючай у Расіі ваеннай сістэмы і аб сродках да ўстаранення іх» знайшлі адлюстраванне ідэі генерала аб тэрытарыяльнай сістэме ваеннага кіравання. На яго думку, пераўладкаванне ў ваенным ведамстве неабходна было б пачынаць з перабудовы цэнтральнай і мясцовай ваеннай адміністрацыі. Укараненне найбольш эфектыўнай формы кіравання войскамі ваенны чыноўнік звязваў з ідэяй стварэння ў Расійскай імперыі ваенных акруг. Нягледзячы на тое, што праект пераўтварэнняў, прадстаўлены Д.А. Мілюціным, насіў дастаткова канструктыўны характар, ён, першапачаткова, не атрымаў належнай увагі і падтрымкі. Аднак яго ідэі часткова былі рэалізаваны падчас арганізацыі ваенна-адміністрацыйнага ўстройства на Каўказе і канчаткова сфарміраваліся ў канцы 1861 г. [3, с. 42; 4, с. 122].

Пэўным штуршком да правядзення карэнных пераўтварэнняў у галіне мясцовага ваеннага кіравання краіны стала ўзмацненне пасля Крымскай вайны 1853–1856 гг. сялянскіх хваляванняў. Грамадска-палітычнае становішча ў дзяржаве ўскладнялася ўздымам нацыянальна-вызваленчага руху ў Каралеўстве Польскім і заходніх губернях імперыі.

Ва ўмовах росту ўнутрыпалітычнай напружанасці ў губернях у вышэйшых урадавых колах узнікла ідэя аб узмацненні ваенна-адміністрацыйнага апарата ўлады на месцах шляхам паўсюднага ўвядзення ў імперыі інстытута часовых генерал-губернатараў з шырокімі надзвычайнымі паўнамоцтвамі: «Часова ўсталяваць паўсюдна ўладу, якая б загадвала упраўленнем некалькіх губерняў, была б забяспечаная надзвычайнымі паўнамоцтвамі, злучала б у сабе функцыі грамадзянскія з ваеннымі і амаль выключна была б накіравана супраць магчымых хваляванняў сярод сялян» [14, с. 641–651]. Міністэрству ўнутраных спраў было даручана падрыхтаваць адпаведныя прапановы па ўказаным пытанні.

Аднак на старонках службовай запіскі, падрыхтаванай міністрам унутраных спраў графам С.С. Ланскім імператару Аляксандру ІІ, адзначалася, што, па-першае, патэнцыяльная пагроза шырокамаштабных сялянскіх хваляванняў моцна перабольшана, па-другое, увядзенне надзвычайных інстытутаў улады для прадухілення магчымых антыўрадавых выступаў можа мець адваротны эфект і падарве давер з боку абывацеляў да цэнтральнай улады, па-трэцяе, заснаванне пасад часовых ваенных губернатараў на ўсёй тэрыторыі краіны прывядзе да парушэння іерархічнага парадку дзяржаўнага кіравання, запатрабуе кардынальнай перапрацоўкі нарматыўна-прававой базы ў галіне дзяржаўнага кіравання, па-чацвёртае, разрастанне бюракратычнага апарату выкліча немінучыя міжведамасныя супярэчнасці [14, с. 647–648]. У выніку вывучэння довадаў графа С.С. Ланскога, імператар Аляксандр ІІ пагадзіўся з немэтазгоднасцю і неэфектыўнасцю прыняцця такіх мер.

Разам з тым дыскусія аб варыянтах і формах рэарганізацыі, якая прайшла ў вышэйшых урадавых колах, пацвердзіла неабходнасць пераўтварэнняў у галіне мясцовага ваеннага упраўлення, накіраваных, з аднаго боку, на яго дэцэнтралізацыю, а з іншага, – стварэнне кампактнага самадастатковага апарату ўлады, які б меў самыя шырокія паўнамоцтвы ў канкрэтным регіёне. У гэтых умовах кіраўніцтва краіны звярнула ўвагу на ідэі генерал-маёра Д.А. Мілюціна. Менавіта з часу прызначэння 30 жніўня 1860 г. на пасаду ваеннага міністра генерала Д.А. Мілюціна звязваюць правядзенне карэнных пераўтварэнняў у арганізацыі ваеннага ўпраўлення ў Расійскай імперыі: «З першых жа крокаў на новай пасадзе прыйшлося мне прыняцца за перабудову нашых ваенных сіл і ўсіх часцей ваеннага кіравання, выпрацаваўшы папярэдне поўную праграму пераўтварэнняў» [5, с. 243]. Менавіта па ініцыятыве і пры самым актыўным удзеле ваеннага міністра пачалася падрыхтоўка ваенна-акруговай рэформы [3, с. 48].

Атрымаўшы ад імператара Аляксандра II папярэднюю ўхвалу галоўных падстаў будучых пераўтварэнняў, ваеннае міністэрства прыступіла да дэталёвай распрацоўкі будучых пераўтварэнняў. У выніку карпатлівай працы ў ваенным ведамстве 15 студзеня 1862 г. быў прадстаўлены прамежкавы варыянт праграмы пераўтварэнняў па розных частках ваеннага ўпраўлення і арганізацыі арміі пад назвай «Усепадданейшы даклад па ваенным міністэрстве» [49, с. 155]. Наступным крокам у распрацоўцы праграмы ваенна-акруговай рэформы стала падрыхтаваная генерал-маёрам Д.А. Мілюціным у пачатку траўня 1862 г. запіска «Галоўныя падставы меркаванага ўстройства ваеннага ўпраўлення па акругах» [5, с. 460]. У ёй у агульных рысах была выкладзена меркаваная арганізацыя ваенна-акруговага ўпраўлення, з указаннем кампетэнцый кожнага аддзела, парадак адносін да галоўнага начальніка акругі і цэнтральнага кіраўніцтва. У запісцы таксама быў прапанаваны варыянт тэрытарыяльнага падзелу імперыі па акругах [4, с. 163].

Першапачаткова спраектаваны падзел некалькі адрозніваўся ад канчатковага варыянта. Меркавалася сфарміраваць на тэрыторыі імперыі 11 акруг. Згодна з планам генерала Д.А. Мілюціна, беларускія землі павінны былі ўвайсці ў склад дзвюх ваенных акруг: Паўночна-Заходняй (Віленская, Гродзенская, Мінская і Магілёўская губерні) і Балтыйскай (Віцебская губерня). Пры гэтым у дакуменце агаворвалася, што гэта толькі ўмоўны варыянт і надалей пытанне патрабуе больш дэталёвай прапрацоўкі, зыходзячы з сукупнасці ваенных, статыстычных, этнаграфічных, тэрытарыяльна-адміністрацыйных і эканамічных фактараў [1, с. 492; 5, с. 461].

Згодна з прапанаваным праектам, кіраўнічы апарат акругі павінен быў складацца з так званага камандавання ўпраўлення – галоўнага начальніка акругі і акруговага штаба, а таксама шэрагу адміністрацыйных устаноў: Савета і чатырох акруговых упраўленняў (інтэнданцкага, артылерыйскага, інжынернага і ўрачэбна-шпітальнага). У задачы акруговага штаба ўваходзілі распараджэнні па камплектаванні войскаў, нагляд за іх станам, улік колькасці, складанне статыстычных звестак і карт. На адміністрацыйныя ўпраўленні акругі ўскладаліся задачы па кіраўніцтве дзейнасцю акруговай артылерыйскай гаспадаркі, інжынернымі работамі, забеспячэннем войскаў харчаваннем, рэчамі і грашыма. Адначасова яны павінны былі інфармаваць ваеннае міністэрства паводле сваіх кампетэнцый аб стане спраў [3, с. 66; 5, с. 461–462].

У далейшым, у ходзе мінулай дыскусіі сярод кіруючага складу арміі і іншых зацікаўленых асоб, нягледзячы на шэраг пэўных недахопаў, ініцыятыва стварэння ваенна-акруговай сістэмы была падтрымана імператарам Аляксандрам II. На аснове канцэпцыі, прапанаванай генералам Д.А. Мілюціным, пачалася распрацоўка праекта Палажэння аб ваенна-акруговых упраўленнях [15, с. 1–5]. Разам з тым, ваенна-палітычнае становішча на захадзе Расійскай імперыі ў пачатку 1860-х гг. складалася такім чынам, што яшчэ да канчатковай тэарэтычнай прапрацоўкі ўсіх бакоў ваеннай рэформы прыйшлося прыступіць да яе практычнай рэалізацыі. Гэтаму працэсу шмат у чым «паспрыялі» падзеі ў Каралеўстве Польскім, Літве, Беларусі і Украіне, дзе пачаліся антырасейскія выступы. Ва ўмовах разрастання маштабаў сялянскага, нацыянальна-вызваленчага руху і пагрозы яго падтрымкі з боку еўрапейскіх дзяржаў (Францыі і Вялікабрытаніі) усё больш бясспрэчным станавіўся той факт, што корпуснае ўстройства, якое існавала ў расійскім войску, не дазваляе эфектыўна супрацьстаяць новым выклікам. Непаваротлівая арганізацыя 1-й арміі не паспявала аператыўна рэагаваць на пашырэнне паўстанцкага руху, раззасяроджанага па ўсей тэрыторыі рэгіёну.

У існуючым становішчы імператару Аляксандру II было прапанавана дэцэнтралізаваць упраўленне 1-й арміі шляхам стварэння на яго аснове трох ваенна-адміністрацыйных цэнтраў у выглядзе Варшаўскай, Віленскай і Кіеўскай ваенных акруг. 6 ліпеня 1862 г. імператар Аляксандр II падтрымаў адпаведную прапанову і зацвердзіў Палажэнне, згодна з якім 1-я армія і 1-ы, 2-і і 3-і армейскія корпусы былі пераўтвораны ў ваенныя акругі. Так, штаб 1-га армейскага корпуса быў перайменаваны ва ўпраўленне войскаў Віленскай ваеннай акругі [16, с. 660–661]. У склад акругі былі ўключаны Віленская, Ковенская, Гродзенская, Мінская і Магілёўская губерні.

Структура кіравання акругай стваралася паступова і шмат у чым насіла эксперыментальны характар. Першапачаткова ў Віленскай ваеннай акрузе быў створаны толькі ваенна-акруговы штаб з часовымі штатамі. Забеспячэнне войскаў акругі ажыццяўлялася ранейшымі гаспадарчымі ўстановамі. Толькі ў канцы 1862 г. было створана акруговае інтэнданцтва, якое адказвала, аднак, за забеспячэнне войскаў выключна прадметамі харчавання, пастаўкі рэчавай маёмасці да жніўня 1864 г. заставаліся ў руках камісарыяцкіх устаноў.

Цэнтральнае кіраўніцтва рабіла далейшыя крокі па пераразмеркаванні ўладных паўнамоцтваў паміж цэнтральнымі і мясцовымі ваеннымі ўладамі. Гэта адносілася, у прыватнасці, да кіраўніцтва артылерыяй. Першапачаткова палявая артылерыя ў акрузе знаходзілася ў падпарадкаванні начальнікаў артылерыйскіх дывізій, а прыгонная – начальнікаў крэпасных артылерыйскіх акруг. Аднак падзеі ў Польшчы паказалі неабходнасць пераадолення такой раз’яднанасці ва ўпраўленні. Аляксандр II 20 сакавіка 1862 г. зацвердзіў палажэнне, у адпаведнасці

з якім на чале артылерыйскага акруговага ўпраўлення быў пастаўлены начальнік артылерыі, які злучаў у сваіх руках начальства над палявой, прыгоннай і аблогавай артылерыяй. У іерархіі адносін захоўвалася існуючая раней дваістасць: у аператыўным плане начальнік артылерыі падпарадкоўваўся генерал-фельдцэймайстру, а па адміністратыўна-гаспадарчых пытаннях – Галоўнаму артылерыйскаму ўпраўленню ваеннага міністэрства.

**Заключэнне.** Такім чынам, вынікі Крымскай вайны 1853–1856 гг. і міжнароднае становішча, якое склалася пасля яе завяршэння, прывялі да ўсведамлення вышэйшымі ўладамі недасканаласці існуючай сістэмы ваеннага кіравання і неабходнасці яе паскоранага рэфармавання. Падрыхтаваныя ў ваенным міністэрстве прапановы па ўдасканаленні ваеннай арганізацыі імперыі ўвабралі ў сябе ўсе асноўныя патрабаванні часу.

Рэалізацыя ваенна-акруговай рэформы на беларускіх землях, звязаная з заснаваннем Віленскай ваеннай акругі, адбывалася ў складаных унутры- і знешнепалітычных умовах, выкліканых увядзеннем ваеннага становішча, сялянскімі хваляваннямі і пачаткам антырасійскай ўзброенай барацьбы ў рэгіёне. Менавіта гэтыя абставіны паслужылі штуршком да практычнай рэалізацыі яшчэ не да канца прадуманых ідэй ваеннага міністра Д.А. Мілюціна. Структура акругі шмат у чым была прыстасавана да выканання ваенна-паліцэйскіх функцый у сувязі з падзеямі ў заходнім рэгіёне імперыі. Віленская ваенная акруга ствaралася ў Расійскай імперыі адной з першых і на аснове часовых заканадаўчых актаў, якія ў далейшым павінны быць ўдакладнены і дапоўнены.

ЛІТАРАТУРА


1. Столетие Военного министерства, 1802–1902: в 13 т. / гл. ред. Д. А. Скалон. – СПб.: Тип. П.Ф. Пантелеева, 1902–1914. – Т. 1: Исторический очерк развития военного управления в России / сост.: Н.А. Данилов, Н.М. Затворницкий. – 1902. – [6], XII, 680 с.
2. Столетие военного министерства, 1802–1902 / гл. ред. Д.А. Скалон. – СПб.: Тип. П.Ф. Пантелеева, 1902–1914. – Приложения к историческому очерку развития военного управления в России / сост.: Н.А. Данилов, Н М. Затворницкий. – 1902. – [6], 189 с.
3. Безугольный А.Ю., Ковалевский Н.Ф., Ковалев В.Е. История военно-окружной системы в России, 1862–1918 – М.: Центрполиграф, 2012. – 463 с.
4. Милютин Д.А. Армия для империи. – М.: Родина, 2023. – 224 с.
5. Воспоминания генерал-фельдмаршала графа Дмитрия Алексеевича Милютина, 1860–1862 / под ред. Л.Г. Захаровой. – М.: «Российский Архив», 1999. – 559 с.
6. История Европы. Т. 5. От французской революции XVIII века до Первой мировой войны. – М.: Наука, 2000. – 667 с.
7. Исторический очерк деятельности Военного управления в России в первое двадцатипятилетие благополучного царствования государя императора Александра Николаевича. (1855–1880 гг.): [в 6 т.]. – СПб.: Тип. М. Стасюлевича, 1879–1881. – Т. 1 / сост. Максимовским, Хорошхиным; под рук. Богдановича. – 1879. – XIII, 421, [62] с.
8. Военные реформы императора Александра II // Вестник Европы. – 1882. – № 1. – С. 3–34.
9. Об учреждении обер-провиантмейстеров взамен Киевского, Виленского и Радомского провиантских комиссионерств // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2: в 55 т. – СПб., 1860. – Т. 33: 1858. Отделение 1. – С. 489.
10. Военно-статистическое обозрение Российской империи, издаваемое по высочайшему повелению при 1-м отделении Департамента Генерального штаба: в 17 т. – СПб.: Тип. Департамента Ген. штаба, 1848–1858. – Т. 8, ч. 1: Витебская губерния / сост. Безкорнилович. – 1852. – [6], 267 с.
11. Военно-статистическое обозрение Российской империи. Издаваемое по высочайшему повелению при 1-м отделении Департамента Генерального штаба: в 17 т. – СПб.: Тип. Департамента Ген. штаба, 1848–1858. – Т. 8, ч. 3: Могилевская губерния / сост. Черницкий. – 1848. – [6], 79, 61 с.
12. Военно-статистическое обозрение Российской империи, издаваемое по высочайшему повелению при 1-м отделении Департамента Генерального штаба: в 17 т. – СПб.: Тип. Департамента Ген. штаба, 1848–1858. – Т. 9, ч. 4: Минская губерния / сост. Стренг. – 1848. – [6], 60 с.
13. Военно-статистическое обозрение Российской империи, издаваемое по высочайшему повелению при 1-м отделении Департамента Генерального штаба: в 17 т. – СПб.: Тип. Департамента Ген. штаба, 1848–1858. – Т. 9, ч. 3: Гродненская губерния / сост. Калмберг. – 1849. – [6], 142 с.
14. Записка о последствиях предполагаемого повсеместного учреждения временных генерал-губернаторов // Русская старина. – 1882. – № 7. – С. 641–652.
15. Свод замечаний по проекту устройства военного управления по округам, составленный в Военном министерстве. – СПб.: Тип. И. Маркова и Ко, 1862. – 433.
16. О главном управлении войсками, входящими ныне в состав 1-й армии // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2: в 55 т. – СПб., 1865. – Т. 37: 1862. Отделение 1. – С. 660–669.


*Поступила 30.01.2024*

## ВНЕДРЕНИЕ ВОЕННО-ОКРУГЖНОЙ СИСТЕМЫ УПРАВЛЕНИЯ НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ 1850-х – НАЧАЛЕ 1860-х гг.

***канд. ист. наук А.В. ХАВАНСКИЙ***
***(Гродненский государственный университет имени Янки Купалы)***

*Рассмотрен широкий круг вопросов, связанных со спецификой подготовки и проведения военной реформы на белорусских землях. В статье определены основные направления деятельности чиновников военного ведомства*

*по разработке вариантов совершенствования системы военного управления. В процессе исследования был проведен углубленный анализ причин, которые обусловили изменения политики правительства в сфере военного управления в регионе. Процессы становления и законодательного оформления окружных институтов управления в регионе показаны в хронологическом порядке сквозь призму нормативно-правовых актов. Выявлены факторы, оказавшие негативное влияние на формирование окружной структуры управления. Показаны организационные мероприятия военного министерства, направленные на совершенствование организации Виленского военного округа. Отмечается, что реализация мер по созданию системы военных округов на белорусских землях в начале 1860-х гг. осуществлялась в сложной международной и общественно-политической обстановке, связанной с последствиями Крымской войны и антиправительственными выступлениями в западных регионах империи. Чрезвычайные обстоятельства определили репрессивный и карательный характер его структуры и полномочий. В то же время, наряду с общими чертами, в процессе формирования Виленского военного округа развивались местные особенности, отражавшие уровень военных угроз в регионе.*

*Результаты и выводы исследования могут быть использованы при подготовке учебных пособий, лекций и спецкурсов по отечественной и военной истории для студентов и курсантов высших учебных заведений Республики Беларусь.*

***Ключевые слова:*** *Российская империя, Виленский военный округ, белорусские земли.*

## INTRODUCTION OF THE MILITARY-DISTRICT MANAGEMENT SYSTEM ON BELARUSIAN LANDS IN THE SECOND HALF OF THE 1850s – EARLY 1860s

***A. KHAVANSKI***
***(Yanka Kupala State University of Grodno)***

*This article examines a wide range of issues related to the specifics of the preparation and implementation of military reform in the Belarusian lands. The work identifies the main directions of activity of military department officials to develop options for improving the military command and control system. During the research, an in-depth analysis of the reasons that led to changes in government policy in the field of military control in the region was carried out. In chronological order, through the prism of normative legal acts, the processes of formation and legislative registration of district management institutions in the region are shown. Factors that had a negative impact on the formation of the district management structure were identified. The organizational measures of the War Ministry aimed at improving the structure of the Vilna Military District are shown. It is noted that the implementation of measures to create a military district system on Belarusian lands in the early 1860s. was carried out in a difficult international and socio-political situation associated with the consequences of the Crimean War and anti-government protests. Extraordinary circumstances determined the repressive and punitive nature of its structure and powers. At the same time, along with general features, in the process of forming the Vilna Military District, local features emerged that reflected the level of military threats in the region.*

*The results and conclusions of the study can be used in the preparation of textbooks, lectures and special courses on national and military history for students and cadets of higher educational institutions of the Republic of Belarus.*

***Keywords:*** *Russian Empire, Vilna Military District, Belarusian lands.*